# ВАЙНА ЗАБРАЛА Ў МЯНЕ ТРАІХ БРАТОЎ

## Успаміны М. Г. Данільчыка, в. Лявонавічы

Сям'я ў нас была вялікая, дружная і працавітая. Сем чалавек. Бацька, Георгій Іванавіч, - каваль, меў кузню. Пры ім навучыўся гэтай адмысловай справе і Мікалай. Перад вайною, помню, ён ужо мог замяніць бацьку ў любой, самай тонкай рабоце. Мікалай быў жанаты, але жыў у хаце з намі. Аляксандр, ажаніўшыся з Вінцэляй, адышоў. Яны ўжо гадавалі маленькую дачушку, любіміцу ўсяе нашай сям'і. Сяргей вучыўся на трактарыста ў Вілейцы. Але - не давучыўся. Пачалася вайна, і Сяргей пешшу прыйшоў дамоў аж з той Вілейкі. Учарнелы ўвесь, ногі ў дарозе падбіў так, што доўга не мог хадзіць. Вера была ў нас адзіная сястрычка. Мы, хлопцы, яе вельмі любілі, нідзе ў крыўду не давалі. Я - самы малодшы ў сям'і, вайна застала мяне шаснаццацігадовым.

... А хутка фашысты ўжо рухаліся па гасцінцы ў бок Ваўкавыска. На матацыклах, на роварах, пешшу. З'явіліся і ў нашай вёсцы Лявонавічы. Рукавы па локці закасаныя - спякота тады ж стаяла. Усіх выганялі на вуліцу, прымушалі здымаць шапкі. Хто стрыжаны - значыць ваенны. А акружэнцы ў нашай вёсцы былі. Трое хлопцаў з Расіі - Іван Бачкоў, Мікалай Бурдзін і Созін (імя яго не памятаю). Немцы іх не знішчылі, а прымушалі працаваць як ваеннапалонных. Іван жыў у хаце Уладзіміра Рыжка, Мікалай у нашага Аляксандра, а Созін у Апанаса Данільчыка. Хлопцы былі вясёлыя, рухавыя, вельмі пасябравалі з нашым Аляксандрам, а праз яго - з Мікалаем і Сяргеем. Толькі і размоў было, што да партызан трэба падавацца. Не сядзелі, склаўшы рукі, шукалі. А хутка зніклі з вёскі. Як я помню, яны былі далёка ад нашых мясцін - у атрадах імя Леніна і Шчорса. Але сувязь з маім братам трымалі, зрэдку з'яўляліся ў Лявонавічах. Прыходзілі ўпотайкі ў нашу хату. Маці мела швейную машынку, то і абшывала іх, абмывала, карміла. Некалькі партызанскіх заданняў меў і я.

Немцы, вядома, заўважылі знікненне ваеннапалонных. І ці то знайшоўся хто і данёс, ці то неасцярожнасць, якую дапусцілі партызаны, але за нашай хатай і хатай Аляксандра пачалі сачыць. Аляксандр сышоў у лес. Аднойчы па дарозе прагрукацела фурманка, спынілася каля нас. Увайшлі ў хату немцы і паліцай - казалі людзі, што ён быў быццам з Бераставіцы. Мяне і братоў адразу паставілі тварам да сцяны. Пашнырылі па хаце і загадалі Сяргею і Мікалаю збірацца. Мяне не кранулі. Можа, разлічвалі, што да мяне яшчэ партызаны ці Аляксандр заявяцца. Мікалая і Сяргея павезлі ў Бераставіцу. Дзе цяпер кніжная крама, тады стаяў нечый хлеў ці свіронак з пустакоў. Сюды звозілі з навакольных вёсак усіх арыштаваных. Назаўтра мяне бацькі

паслалі, каб занёс братам чаго паесці. Але - не сумеў... Ішоў, задумаўшыся, па бераставіцкай вуліцы і не паспеў загадзя зняць шапку перад немцам. Той як урэжа мне гумаю па мяккім месцы! Ледзьве да хаты жывы дабраўся. Мікалай і Сяргей пабылі ў тым свіронку некалькі дзён, потым іх завезлі ў Ваўкавыск, у лагер, а адтуль - у беластоцкую турму.

Не расказаць, як гаравалі бацькі! Сэрца маці прадчувала страшную бяду. «Не ўбачу больш сваіх сыночкаў», - паўтарала. Убачыла. Толькі ў такім месцы, што не дай Бог нікому!

... Праз паўтара тыдні каля нашай хаты зноў спынілася фурманка з немцамі. На гэты раз забралі бацьку, маці, маю сястрычку Веру і Вінцэлю, жонку Аляксандра. А ў яе ж дачушка маленькая, яшчэ і трох гадоў няма, ды сама цяжарная. Людзі не маглі глядзець без слёз, як усіх іх везлі праз вёску.

Я застаўся ў шаснаццаць гадоў у хаце за гаспадара. Яшчэ жыла жонка старэйшага брата Мікалая. Да нас адразу прывезлі і дзяўчынку Вінцэлі, бо бабуля яе жыла ў іншай вёсцы, ды і ад гора сябе не помніла.

А ў полі паспела жыта, трэба сабраць, змалаціць. Каб Аляксандр быў, то не бяда, удваіх управіліся б. Але ён хаваўся то ў лесе, то па добрых людзях. І ўсе ж не вытрымаў, прыйшоў цішком дахаты. Пра гэта ведаў толькі я. Хаваў брата ў гумне. Прывязу воз снапоў з поля, выгружу, гумно закрыю, а ён іх там пакрысе складвае. Зрабіў сабе сховішча ў снапах, там і жыў. Я насіў Аляксандру паесці, папіць. Вельмі асцерагаліся, каб ніхто не ўведаў, і ўсе ж...

У жонкі Мікалая з'явіўся ўхажор з Вараноў. Нядобры чалавек, пра тое ўсе ў акрузе ведалі. І вось гэты ўхажор, які часта бываў у нас, пранюхаў нейкім чынам, што Аляксандр хаваецца ў гумне.

Мяне ў той дзень не было, адлучыўся ў Стары Дворац - я часта сыходзіў куды-небудзь, бо баяўся, што немцы забяруць і мяне. Дык ён зайшоў у гумно і паклікаў сціху Аляксандра. Той, мусіць, не разабраўся, што гэта не я, і падаў голас са свайго сховішча. Гэтым і загубіў сябе. Гэты нягоднік з Вараноў скруціў Аляксандра і адвёз у Пархімаўцы, здаў немцу, які жыў у былым панскім палацы.

А назаўтра брат апынуўся ў Бераставіцы, у тым самым свірне, дзе пабывалі ўжо Мікалай і Сяргей. Але Аляксандра трымалі ўжо ў асобным закутку, рукі і ногі - у кайданах. Так я яго больш і не бачыў. Блізка да свірна не падыдзеш - стаіць варта. І здалёк праз вокны не ўгледзіш - яны маленькія, на пустак, і пад самай страхой. Можна было насіць перадачы - навошта ж немцам карміць арыштаваных? Дык вось я перадаў Аляксандру долата, запечанае ў бохане хлеба. За ноч ён раскаваў з рук і ног кайданы, выдзеўб два пустакі і так ціхенька - нават вартавы каля дзвярэй нічога не чуў! - вылез пад ранак на вуліцу.

Дабраўся да касцёла, а каля яго раслі высокія елкі. Немцы хутка агледзеліся, паднялі трывогу. Акружылі пасёлак, пачалі шукаць па вуліцах. Аляксандр узабраўся на самую вяршаліну елкі - не ўцямлю, як ён даў рады, збіты! - і там стаіўся.

Стала світаць. Трэба было ўцякаць. Аляксандр скочыў уніз, і цераз дарогу ў грабавую алейку пабег (цяпер тут стаіць дзіцячы садзік). Хацеў, мусіць, дабегчы да паляжынскіх ставаў. А тут якраз паказаліся яўрэі - іх немцы гналі так рана на работу. У калясцы матацыкла фашыст-канвойны, які меў кулямёт. Ён, гад, і прашыў чаргой Аляксандра. Потым расказвалі, што той упаў адразу, схапіўшыся за жывот. Але фашысту здалося гэтага мала. Дабег і прыкладам знёс Аляксандру чэрап...

Яго тут жа, пры алейцы, і закапалі ў яму. Ужо потым я перавёз цела брата на могілкі ў Вярэйкі, дзе пахаваны нашы дзяды і прадзеды.

Смерць Аляксандра патрэсла мяне так, што не хацеў і жыць. Браты ў турме, бацькі ў турме, з імі і Аляксандрава жонка. У роднай хаце мне не было месца, ды і сам не мог тут быць - да Мікалаевай жонкі перабраўся ўхажор. Той гад, які здаў немцам Аляксандра. Сэрца маё згарала ад болю, крыўды і нянавісці. Гэты Клімовіч раз'язджаў па вёсках на бацькавай брычцы, якую той выкаваў у кузні сваімі рукамі, аздобіў яе прыгожымі тонкімі карункамі з жалеза.

Ведаў я і тое, як цяжка маім родным у беластоцкай турме. Людзі расказвалі, што там пухнуць з голаду і мруць, як мухі. Хто аслабне і не можа ўжо працаваць, таго фашысты выкідваюць пад сцяну, каб здыхаў. А майму ж бацьку было за шэсцьдзесят...

Мікалай і Сяргей калі-нікалі бачылі бацькоў, сястру, Вінцэлю. Вінцэлі было асабліва цяжка - рыхтавалася вось-вось нарадзіць, і пакуты голаду, пакуты фізічныя зусім знясілілі яе. Вязняў расстрэльвалі. З варот турмы перыядычна выязджала крытая машына з людзьмі, і ўсе ведалі: гэта смяротнікі. Жыхары Беластока часта чулі стрэлы аднекуль з-за горада.

Аднойчы маці ўбачыла ў акно турмы, як адпраўлялі гэтую страшную машыну ў чарговы рэйс. Прыгледзелася лепей: у кузаве разам з іншымі стаялі Мікалай і Сяргей! У адной бялізне, рукі скручаны калючым дротам. Маці закрычала, заплакала. Машына кранулася. Больш сыноў бацькі не бачылі. Іх расстралялі, як і ўсіх, каго вывозілі. Мікалаю было трыццаць гадоў, Сяргею - дваццаць.

Дамоў бацькі і Вінцэля вярнуліся, правёўшы ў турме 11 месяцаў. Братавая прынесла на руках дзяўчынку, якую нарадзіла ў няволі. Дзіця было як націнка, бледнае, кволае. Бацька прыйшоў дахаты апухлы з голаду, як калода. Ён доўга і не пажыў, памёр праз пару гадоў. Веру з

турмы пагналі ў Германію. Дабрыла дахаты ўжо ў 1945 годзе, як іх вызвалілі нашы войскі.

Вось так распалася наша вялікая, дружная сем'я. Загубілі маіх траіх братоў фашысты праклятыя! Маці плакала ўвесь час, колькі жыла - а памерла яна ў 1969 годзе. Мора слёз выплакала. Калі летам у 1944 годзе прыйшла наша армія і на вайну забралі мяне, апошняга яе сына, думалі, што не перанясе ўжо гэтага. Аднак я трапіў у запасны полк, які стаяў у Барысаве, і ваяваць мне не давялося.

Сястра Вера жыве цяпер у Індуры. Я ўсё жыццё пражыў у сваіх Лявонавічах. Пасля вайны, як закончыў курсы шафёраў, так і працаваў увесь час у калгасе «Перамога» на розных грузавых машынах. Цяпер на пенсіі. Маю траіх дзяцей, унукаў. І аднаго ім жадаю: каб ніколі не давялося глядзець у твар вайне.

Успаміны Міхаіла Георгіевіча Данільчыка запісала
Марыя Драпеза, в. Лявонавічы, 1998 год.